# ТАПОНІМЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ АНАТОЛЯ ЗЭКАВА (ПАВОДЛЕ ПАЭТЫЧНАГА ЗБОРНІКА «ПРЫГАРАДНЫЯ ЧАЙКІ»)

**Шэвель Ангеліна (УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мозырь)**
**Навуковы кіраўнік – В.Р. Слівец, канд. філал. навук**

Анатоль Зэкаў – адна з яркіх постацей сучаснай беларускай літаратуры. Ён вядомы сваімі мастацкімі творамі, у якіх пераплятаюцца глыбокая філасофія, любоў да Бацькаўшчыны і імкненне да абароны нацыянальнай самабытнасці. Найважнейшая ідэя яго творчасці – праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку назваў родных вёсак і вуліц. Так, у адным з інтэрв’ю А. Зэкаў прызнаваўся: *«Можна пісаць вершы філасофскія, пра каханне, прыроду, але гэта зробіць любы. А тое, што я напішу пра сваю вёску, пра свой раён, – зраблю толькі я ці той, хто тут нарадзіўся. Лічу, што гэта мой абавязак – пакінуць землякоў у гісторыі з дапамогай вершаў, слова. <...> У мяне шмат вершаў і пра вёску, і пра землякоў з іх мянушкамі – хачу, каб засталіся ў памяці»* [1].

Анатоль Зэкаў нарадзіўся ў вёсцы *Патапаўка* Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Адпаведна, онім *Патапаўка* займае цэнтральнае месца ў аўтарскім тапаніміконе, што абумоўлена фактамі біяграфіі паэта, і з’яўляецца самым ужывальным. Нават калі сёння ў сваёй вёсцы паэт бывае толькі зрэдку, духоўная еднасць з родным кутам не парушана: *І па сёння ў сталіцы, / з якой звязаны лёсам, / мне* ***Патапаўка*** *сніцца, / мая родна вёска* [2, с. 236]; *На маёй малой радзіме, / у* ***Патапаўцы****, ля* ***Буды****, / нават дзень – / сцюдзёны, зімні – / не здаецца мне астудным* [2, с. 296]. Асобныя вехі на жыццёвым шляху А. Зэкава таксама адзначаны назвамі *Буда-Кашалёў*, *Гомель* і *Мінск*.

У сваіх мастацкіх творах, падчас гутарак з журналістамі, на сустрэчах з чытачамі А. Зэкаў нярэдка закранае тэму перайменавання вуліц. Ён адкрыта выступае супраць гэтай грамадскай з’явы і лічыць, што кожная назва мае сваю глыбіню і гісторыю, а змяненне традыцыйных назваў можа адбіцца на культурнай памяці жыхароў: *«Кривичи, Хуторы, Бочановка, Хмыза, Середина, Гавельский Шлях, Луна... Улицы моего детства. Каждой зимой их заметало по самые макушки заборов, и мы бежали на лыжах, лишь переступая изгородь, как небольшие барьеры... Увы, нет уже сегодня тех звенящих неугомонными детскими голосами улиц. Сами-то они, конечно, остались, а вот названия у них теперь другие. На дома даже таблички, которых до этого никогда не было, приколотили. Словно гвозди в память вбили. И стали Хуторы – Советской, Гавельский Шлях, своим названием*

*указывающий дорогу на соседнюю деревню Гавли, – Комсомольской, мои Кривичи – Пролетарской»* [3]. Аўтар падкрэслівае важнасць захавання менавіта народных тапонімаў, якія часта звязаны з мясцовымі легендамі, паданнямі і рэгіянальнымі традыцыямі: *...Час праляцеў – і ўжо бачна здаля, / што маладых стала меней у вёсцы, / як і на вуліцы **Гавельскі Шлях**, / хоць і завецца яна **Камсамольскай*** [2, с. 214]; ***Крывічы**, **Хутары** і **Сярэдзіна** – / як далёкіх вякоў адгалоскі. / Гэтак памяць маю развярэдзілі / сёння вуліцы роднае вёскі* [2, с. 215]; *Дзе, **Бачанаўка**, ты? / Дзе – **Салёпаўка**? / Вас на лад перайначылі новы. / Толькі памяць мая ўсё галёкае / пад адвечным для кожнай назовам...* [2, с. 215].

Своеасаблівую даніну памяці аддае паэт не толькі роднай *Патапаўцы*, але і суседнім вёскам, якія таксама ўтвараюць прастору яго малой радзімы: *Думкі назва развярэдзіла – / і адкуль з'явіцца ёй такой, / вёсцы з назваю **Мядзведзева** / тут, каля **Патапаўкі** маёй?* [2, с. 216]; *Праз майго маленства вёскі – / **Гаўлі**, **Муравей**, **Галы** – / неслі ў вырай пагалоскай / журавы свае "курлы"* [2, с. 227]; *Назва гэтай вёскі – **Гарадок**, / яна ўжо і не вёска сёння* [2 с. 260]; *Іду развацжліва, няспешна, / сваёй **Патапаўкай** паўпрэд, / і з хат жанчыны ў **Жытанежжы** / праз вокны мне глядзяць услед...* [2, с. 298].

Як правіла, часткай тапанімічнай прасторы з'яўляюцца гідронімы – назвы водных аб'ектаў. Аднак у Патапаўцы вадаёмаў не было, аб чым сведчыць і сам А. Зэкаў: *«Я всегда завидовал своим друзьям, выросшим на речке. Мне же с рекой не повезло. Правда, когда-то неподалеку протекала Липа, но осушили окрестные болота – потерялась и она»* [3]. Між тым, у тапанімікон паэтычнага зборніка «Прыгарадныя чайкі» ўвайшлі некаторыя гідронімы, рэгіянальна суадносныя з Гомельшчынай, адкуль родам паэт: *Наўрад ці тое ўжо забудзеш, / калі ў малечыя гады / палілі вогнішчы ля **Друці** – / і да **Дняпра** аж слаўся дым* [2, с. 258].

Такім чынам, паэтанімікон мастацкіх твораў А. Зэкава насычаны рэгіянальнымі тапонімамі, якія задзейнічаны ў стварэнні вобраза яго малой радзімы. Акрамя гэтага, праз зварот аўтара да такіх геаграфічных найменняў вырашаецца праблема захавання гісторыка-культурнай пераемнасці паміж пакаленнямі, акцэнтуецца ўвага на матываваным выбары назваў (асабліва ўнутрысельскіх аб'ектаў) як адлюстраванні рэалій жыцця пэўнага рэгіёна.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД (грант Г24М-047).*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Анатоль Зэкаў: "Радзіма не можа быць малой – яна заўсёды вялікая" / Н. Святлова. – URL: https://zviazda.by/be/news/20231110/1699610225-anatol-zekau-radzima-ne-mozha-byc-maloy-yana-zausyody-vyalikaya (дата звароту: 25.03.2025).

2. Зэкаў, А. М. Прыгарадныя чайкі. Вершы / А. М. Зэкаў. – Мінск : Харвест, 2019. – 352 с.

3. Возвращение в детство: путешествие с Анатолием Зэковым / А. Зэков. – URL: https://www.sb.by/articles/vozvrashchenie-v-detstvo-2.html (дата звароту: 15.03.2025).

## ТЕХНОЛОГИЯ РАЗВИТИЯ КРИТИЧЕСКОГО МЫШЛЕНИЯ НА УРОКАХ РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

**Шевченко Вера (УО МГПУ им. И.П. Шамякина, г. Мозырь)**
**Научный руководитель – И.Л. Судибор, старший преподаватель**

Использование современных технологий на уроках русской литературы в учреждениях образования способствует созданию благоприятной среды для всестороннего развития учащихся. Новые подходы к преподаванию, основанные на технологиях, помогают ученикам лучше понимать себя, развивать свои моральные качества, творческие способности и интеллект. Более того, эти методы помогают формировать у обучающихся важные навыки, необходимые для учебы и жизни, такие как умения общаться, думать, анализировать, принимать решения и управлять своим временем.

**Критическое мышление** – это система мыслительных стратегий и коммуникативных качеств, позволяющих эффективно взаимодействовать с информационной реальностью[1, с. 240]. Слово *«критическое»* происходит от двух греческих слов: *«kritike»* − искусство судить и *«kriterion»* − средство для суждения. Потому понятие *«критическое»* предполагает оценочный компонент.[1, с. 240].

Данная технология направлена на формирование у учащихся комплекса мыслительных навыков, которые необходимы не только для успешного обучения, но и для эффективной адаптации к жизни в обществе. В её рамках особое внимание уделяется развитию способности обучающихся к взвешенному принятию решений, работе с информацией и анализу многоаспектных явлений.

Методика развития критического мышления включает три ключевые стадии: вызов, осмысление и рефлексию. На первой стадии важно пробудить интерес к познанию, а также сформировать стремление к получению и углублению новой информации. Вторая стадия подразумевает взаимодействие с новой информацией, ее систематизацию и анализ. Ученик